Упраўленне па адукацыі Мінскага раённага выканаўчага камітэта
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Каралёвастанская базавая школа»

ПЕДАГАГІЧНЫ ПРАЕКТ

“Фарміраванне станоўчай матывацыі да вывучэння беларускай мовы ў вучняў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі праз стварэнне медыятэкстаў”

Тэрміны рэалізацыі: 2024-2026гг.

Кіраўнік праекта:
Панкратава Алена Яўгеньеўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры

**Агульныя звесткі**

**Юрыдычная назва ўстановы адукацыі**

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Каралёвастанская базавая школа»

**Тэма педагагічнага праекта**

МЕДЫЯМОВА: фарміраванне станоўчай матывацыі да вывучэння беларускай мовы ў вучняў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі праз стварэнне медыятэкстаў

**Тэрміны рэалізацыі педагагічнага праекта**

2024/2025 – 2025/2026 навучальны год

**Кіраўнік установы адукацыі** – Бурко Аліна Рыгораўна

**Звесткі пра кіраўніка педагагічнага праекта**

Панкратава Алена Яўгеньеўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры

**Удзельнікі рэалізацыі педагагічнага праекта:**

Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці

Касікоўская К.М., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці

Жылянок М.А., педагог-псіхолаг

Аўсова С.В., настаўнік мастацтва

Папова В.А., Шынкевіч А.Ю., настаўнікі гісторыі

Селівончык К.Ю., настаўнік геаграфіі

Латушка А.М., настаўнік біялогіі

Вучні V-IX класаў

Законныя прадстаўнікі вучняў

**Актуальнасць педагагічнага праекта**

Паводле пункта 1 артыкула 10 Кодэкса аб адукацыі, фарміраванне ў вучняў грамадзянскасці і патрыятызму - адна з мэт адукацыі [5]. Асноўны крытэрый гэтых паняццяў - паважлівае стаўленне да нацыянальнай культуры і мовы. З гэтага вынікае, што вучэбны прадмет "Беларуская мова" валодае асаблівымі, першаснымі выхаваўчымі магчымасцямі для падрастаючага пакалення як для грунту грамадзянскасці ў нашай краіне, таму і матывацыя да яго вывучэння – важны аспект навучання і выхавання на II ступені сярэдняй адукацыі [8-А].

Аднак педагагічная практыка паказвае нізкую матывацыю вучняў да вывучэння беларускай мовы. І гэта педагагічная праблема асабліва востра выявілася ва ўмовах дапрофільнай падрыхтоўкі. На практычным узроўні яна праяўляецца ў нязначнай колькасці вучняў, жадаючых вывучаць беларускую мову на павышаным узроўні. Дадзеная праблема нараджае актуальнасць стварэння эфектыўнай сістэмы работы па фарміраванні станоўчай матывацыі школьнікаў да вывучэння беларускай мовы ў рамках дапрофільнай падрыхтоўкі [7-А].

Вырашэнне задачы фарміравання станоўчай матывацыі да вывучэння беларускай мовы ў сучаснага «лічбавага» пакалення патрабуе скарыстання такіх спосабаў навучання, якія маглі б быць максімальна займальнымі для

вучняў, актуальнымі для іх інтэлектуальных запытаў, адпавядаць іх узроставым асаблівасцям і патрэбам часу.

Актуальнасць абранага кірунку педагагічнага праекта абумоўлена супярэчнасцямі, якія маюць месца ў сучаснай адукацыйнай практыцы:

- паміж фактам прызнання беларускай мовы тытульнай мовай нацыі і адсутнасцю вучняў, гатовых вывучаць яе на павышаным узроўні;
- паміж штодзённымі зносінамі вучняў у сацсетках і ўжываннем беларускай мовы выключна на вучэбных занятках;
- паміж высокім адукацыйным патэнцыялам медыярэсурсаў і недастатковай распрацаванасцю пытання іх эфектыўнага скарыстання як спосабу навучання беларускай мове;
- паміж фактам распаўсюджанай пісьмовай медыякамунікацыі вучняў праз сацсеткі і традыцыйныя формы пісьмовых работ у сшытках на ўроках беларускай мовы.

Такім чынам, педагагічны праект арыентаваны на вырашэнне праблемы матывацыі да вывучэння беларускай мовы ва ўмовах дапрофільнай падрыхтоўкі праз

1. скарыстанне магчымасцей медыярэсурсаў для навучання беларускай мове,
2. пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы шляхам яе інтэграцыі ў адукацыйны працэс.

**Мэта**: фарміравання станоўчай дынамікі матывацыі да вывучэння беларускай мовы ў вучняў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі

**Задачы**:

- выпрацаваць паслядоўнасць дзеянняў пры рабоце з медыятэкстам як спосабам вучэбнай дзейнасці пры навучанні беларускай мове;
- стварыць і рэалізаваць сістэму эфектыўнага скарыстання работы з медыятэкстам на ўроках беларускай мовы ў V-IX класах у адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбнай праграмы;
- стварыць алгарытм інтэграцыі беларускамоўнага медыятэксту ў адукацыйны працэс;
- выявіць дынаміку матывацыі да вывучэння беларускай мовы ў сувязі з выкарыстаннем медыятэксту як спосабу вучэбнай дзейнасці;
- размясціць на сайце УА каталог медыятэкстаў, створаных вучнямі ў працэсе вывучэння беларускай мовы;
- прадставіць метадычнае абгрунтаванне скарыстання медыятэксту як спосабу вучэбнай дзейнасці.

**Тэарэтычнае абгрунтаванне педагагічнага праекта "Медыямова"**

У аснову ідэі праекта пакладзены фактар, што матывацыя для паспяховай вучобы важнейшая за інтэлект. Усведамленне высокай значнасці матыву пры навучанні і скарыстанне прынцыпу матывацыйнага забеспячэння навучальнага працэсу сфармулявана ў навуковых працах І.П. Падласага па тэорыі матывацыі навучання [9]. Сярод разнастайных матываў вучэння

вучоны выдзяляе знешнія і ўнутраныя матывы. Педагагічны праект “Медыямова” прадугледжвае фарміраванне унутранага матыву (жадання да вывучэння беларускай мовы), сутнасць якога ў тым, каб супадаць з мэтай вучэбнай дзейнасці па дадзеным вучэбным прадмеце. Гэта задача будзе рэалізоўвацца праз спецыфічную арганізацыю ўмоў вучэбнага працэсу, пры якім авалоданне зместам вучэбнага прадмета «Беларуская мова» праз стварэнне медыятэксту мусіць выступіць адначасова і матывам, і мэтай вучэбнай дзейнасці.

Такім чынам фарміраванне станоўчай матывацыі да вывучэння беларускай мовы стварэнне медыятэкстаў будзе грунтавацца на эфектыўных прыёмах матывацыі, сфармуляваных І.П. Падласым, якія прадугледжваюць

- стаўленне да мовы як да сродку зносін, а не толькі як да прадмета вывучэння,
- пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы ў нестандартных для вучняў сітуацыях,
- папулярызацыю беларускай мовы сродкамі медыятэкстаў у сацсетцы,
- адкрытай інфармацыі аб творчых і вучэбных дасягненнях,
- сучасныя формы абуджэння і фарміравання пазнавальных інтарэсаў пры вывучэнні беларускай мовы,
- вырашэнне пэўных актуальных для вучняў праблем сродкамі вучэбнага прадмета «Беларуская мова»,
- жывой і цікавай арганізацыі навучальнага працэсу.

Дыдактычны складнік праекта «Медыямова» цалкам адпавядае падыходам і прынцыпам, сфармуляваным у канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская мова» [3].




Малюнак 1. – Дыдактычны складнік праекта «Медыямова»

Аўтарская методыка дыягностыкі накіраванасці вучэбнай матывацыі доктара псіхалагічных навук прафесара Т. Д. Дубавіцкай дазволіць прасачыць эфектыўнасць дадзеных прыёмаў пры фарміраванні і вызначэнні нізкага, сярэдняга і высокага ўзроўняў унутранай матывацыі вучняў V-IX класаў да вывучэння беларускай мовы [2].

Тэарэтычны падмурак ідэі педагагічнага праекта “Медыямова” склалі працы вучоных па тэорыі асобасна-дзейнаснага падыходу да навучання (Л.С. Выгоцкі, П.Я. Гальперын), па тэорыі тэхналагізацыі навучання (І.Я. Лернер, М.І. Запрудскі, С.С. Кашлеў), па тэорыі медыяадукацыі (Л.Д. Глазырына, С.І. Колбышава, Я. Е. Столбава, А.В. Фёдараў).

**Мадэль будучага адукацыйнага працэсу**

1. Беларускамоўныя медыятэксты ствараюцца ў якасці вучэбнай маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай па беларускай мове ў адпаведнасці з камунікатыўна-дзейнасным падыходам.

Табліца 1. – Прыклад скарыстання медыятэксту як спосабу вучэбнай дзейнасці ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай 8 класа [4-А].

| Клас | Тэма | Від маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай | Медыятэксты |
|---|---|---|---|
| VIII клас | Просты сказ | Падрыхтоўка паведамлення на маральна-этычную тэму | Медыяпаведамленне пра дзейнасць валанцёрскай групы **з** размешчэннем у суполцы сацсеткі |
| | Апісанне як тып маўлення | Водгук на празаічны або вершаваны твор | Медыяводгук «Пра што твор Якуба Коласа «Хмарка?» размешчаны ў суполцы сацсеткі |
| | Двух-састаўныя сказы | Пераказ зместу кінафільмаў, урыўкаў з мастацкіх твораў | Медыяанонс любімага мастацкага фільма |
| | Сказы са звароткамі | Напісанне віншаванняў, афіцыйных пісьмаў і сяброўскіх лістоў | Афіцыйнае медыявіншаванне |

2. Медыятэксты размяшчаюцца ў медыяпрасторы, інтэгруюцца з іншымі вучэбнымі прадметамі, сферу дадатковай адукацыі і розныя напрамкі выхаваўчай работы ў адпаведнасці з практыкаарыентаваным падыходам да навучання.

3. Пашырэнне сферы выкарыстання беларускай мовы дасць магчымасць забяспечыць беларускамоўную камунікацыю вучняў у розных маўленчых сітуацыях, што будзе спрыяць стварэнню адмысловага адукацыйнага беларускамоўнага асяроддзя [6-А].

4. Стварэнне беларускамоўнага адукацыйнага асяроддзя паспрыяе фарміраванню станоўчай матывацыі да вывучэння беларускай мовы праз задавальненне пазнавальных інтарэсаў вучняў у адпаведнасці з іх узростам, імкненнем да скарыстання ў вучэбным працэсе інфармацыйных тэхналогій і ўжыванне беларускай мовы ў займальнай практычнай дзейнасці [7-А].

5. Дасягненне вучнямі асобасных адукацыйных вынікаў, фарміраванне груп з вывучэннем беларускай мовы на павышаным узроўні стане паказчыкам станоўчай дынамікі матывацыі вучняў да вывучэння беларускай мовы на II ступені сярэдняй адукацыі.

6.Абагульненне вынікаў педагагічнага праекта, стварэнне метадычнага прадукта по скарыстанні медыятэксту, трансляцыя перадавога педагагічнага вопыту.




Малюнак 2. – Мадэль будучага адукацыйнага працэсу

**Крытэрыі і паказчыкі ацэнкі вынікаў педагагічнага праекта**

| № п/п | Крытэрыі | Паказчыкі |
|---|---|---|
| 1 | Кагнітыўны | пазнаваўчы інтарэс да вывучэння беларускай мовы;<br>здольнасць карыстацца мовай як сродкам зносін;<br>здольнасць трансліраваць мову праз створаныя медыятэксты; |
| 2 | Матывацыйны | жаданне павышаць узровень валодання беларускай мовай;<br>станоўчая матывацыя да яе вывучэння і ўжывання;<br>ажыццяўленне дзейнасці па скарыстанні і трансляцыі беларускай мовы праз стварэнне медыятэкстаў |
| 3 | Дзейнасны | уменне ствараць і практычна скарыстоўваць беларускамоўны медыятэкст;<br>дыягнастыка узроўню сфарміраванасці матывацыі да вывучэння беларускай мовы (нізкі, сярэдні, высокі);<br>стварэнне груп з вывучэннем беларускай мовы на павышаным узроўні. |
| 4. | Метадычны | фармуляванне метадычнага складніку вопыту скарыстання медыятэксту як спосабу вучэбнай дзейнасці для фарміравання матывацыі да вывучэння беларускай мовы |

**Спіс скарыстаных крыніц**


1. Божович Л. И. Проблема развития мотивационной сферы ребенка // Изучение мотивации поведения детей и подростков. М., 1972.
2. Дубовицкая Т.Д. Методика диагностики направленности учебной мотивации // Психологическая наука и образование. 2002. № 2. С. 42–45.
3. Канцэпцыя вучэбнага прадмета “Беларускя мова” [Электронны ресурс].– Рэжым доступу: https://disk.yandex.by/d/LOjvg23d2k_cK – Дата доступу: 30.03.2024.

4- А. Каталог вучнёўскай медыятворчасці па вучэбных прадметах “Беларуская мова”, “Беларуская літаратура” [Электронны ресурс].– Рэжым доступу:https://docs.google.com/document/d/1F7H7YjyQ2Ij1yYXO1VsvcluVKQ

mDI1Pc/edit?usp=sharing&ouid=102549348533897749172&rtpof=true&sd=true– Дата доступу: 30.03.2024.

5. Кодекс Республики Беларусь об образовании. – Минск: РИВШ. – 352 с.

6–А. Панкратава, А.Я. Ад медыяспажыўцоў да медыястваральнікаў. Сродкі фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці / А. Я. Панкратава // Народная асвета. – 2016. – № 3. – С. 51-55.

7–А. Панкратава, А. Я. Беларуская мова для «лічбавага» пакалення. Медыятэкст як сродак фарміравання станоўчай матывацыі да вывучэння беларускай мовы ва ўмовах дапрофільнай падрыхтоўкі/ А. Я. Панкратава // Народная асвета. – 2019. – № 1.– С. 38-41.

8–А. Панкратава, А. Я. Інавацыйныя падыходы да кіравання развіццём нацыяальна-культурнай ідэнтычнасці суб'ектаў адукацыйнага працэсу ва ўмовах установы агульнай сярэдняй адукацыі // Рэпазіторый БГПУ [Электронны ресурс]. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/19905– Дата доступу: 22.01.2017.

9. Подласый, И.П. Педагогика: 100 вопросов - 100 ответов: учеб. пособие для вузов/ И. П. Подласый. -- М.: ВЛАДОС-пресс, 2004. - 365 с.

10. Столбова, Я. Е. Особенности работы с медиатекстом в школе [Электронны ресурс]. – Рэжым доступу: http://vestnik.yspu.org/releases/2013_1pp/21.pdf – Дата доступу: 10.01.2017.

11. Фаткуллина, Ф.Г., Хабиров, Р.Р. Медиатекст в современном коммуникативном пространстве // Современные проблемы науки и образования. – 2015. – № 1-1.

12. Фёдоров, А.В. СЛОВАРЬ ТЕРМИНОВ по медиаобразованию, медиапедагогике, медиаграмотности, медиакомпетентности [Электронны ресурс]. – Рэжым доступу: http://www.evartist.narod.ru/text23/0013.htm– Дата доступу: 21.03.2024.

Праграма рэалізацыі педагагічнага праекта
“Фарміраванне станоўчай матывацыі да вывучэння беларускай мовы ў вучняў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі праз стварэнне медыятэкстаў”
(2024-2026)

| **Першы этап: падрыхтоўчы** 01.09.2024– 01.11.2024 | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| № | Змест работы | | Арганізацыйна-кіраўнічае, інфармацыйнае, метадычнае забеспячэнне работы | Самакантроль (формы, тэрміны) | Запланаваныя вынікі |
| | з педагогамі | з навучэнцамі | | | |
| | | | | | |
| 1. | Распрацоўка і ўзгадненне каляндарнага плана | | Праграма рэалізацыі педагагічнага праекта | Паседжанне метадычнага аб’яднання | Каляндарны план |
| 2. | Падрыхтоўка метадычных рэкамендацый для педагогаў па інтэграцыі вучнёўскіх медыятэкстаў у працэс навучання ў адпаведнасці вучэбнай праграмай | Падрыхтоўка рэкамендацый для вучняў па стварэнні медыятэксту | На аснове перадавога педагагічнага вопыту | Паседжанне творчай групы | Распрацоўка алгарытму скарыстання вучнёўскіх медыятэкстаў у вучэбным працэсе |
| 3 | Арганізацыя ўзаемадзеяння педагога-псіхолага і педагогаў у рамках праектнай дзейнасці | Арганізацыя першаснай дыягностыкі ўзроўню матывацыі да вывучэння беларускай мовы | Графік правядзення дыягностыкі; метадычныя матэрыялы, на основе якіх распрацоўваюцца дыягнастычныя інструменты | Паседжанне творчай групы | Дыягнастычныя матэрыялы |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |
| **Другі этап: укараняльны** 02.11.2024 – 28.02.2026 | | | | | |
| № | Змест работы | | Інфармацыйнае, метадычнае забеспячэнне работы | Самакантроль (формы, тэрміны) | Запланаваныя вынікі |
| | з педагогамі | з навучэнцамі | | | |
| 1. | Стварэнне медыязаданняў у адпаведнасці з вучэбнай праграмай | Апрабацыя матывацыйнага і вучэбнага эфектаў медыятэкстаў | Медыятэксты | Маніторынг | Інтэграваныя медыязаданні |
| 2. | Правядзенне ўрокаў і мерапрыемстваў з выкарыстаннем медыятэкстаў | Укаранне медыятэкстаў у вучэбны працэс | Графік правядзення ўрокаў і мерапрыемстваў з выкарыстаннем медыятэстаў | Паседжанне творчай групы | Педагагічнае партфоліа |
| 3. | Арганізацыя і правядзенне семінараў, майстар-класаў, мерапрыемстваў, метадычных аб'яднанняў па тэме праекта | Арганізацыя работы навучэнцаў у віртуальнай прасторы | Метадычныя распрацоўкі ўрокаў з выкарыстаннем медыятэкстаў | Інфармацыя па выніках правядзення метадычных мерапрыемст ваў | Сцэнарыі семінараў, майстар-класаў |
| 4 | Правядзенне паседжання педагагічнага савета | Стварэнне медыяпраектаў | Узаеманаведванне ўрокаў, анкетаванне, інтэрв'ю | Пратакол педагагічнага савета | Сцэнарый педагагічнага савета |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 5. | Забеспячэнне кансультацыйнай дапамогі | Правядзенне прамежкавага маніторынгу ўзроўню матывацыі да вывучэння беларускай мовы: | Метадычныя матэрыялы, на аснове якіх распрацоўваюцца дыягнастычныя інструменты | Абмеркаванне вынікаў маніторынгу на паседжанні творчай группы | Дыягнастычныя матэрыялы. Вынікі дыягностыкі |

**Трэці этап: рэфлексіўны (ацэначны)** 01.03.2026 – 31.05.2026

| № | Змест работы | | Інфармацыйнае, метадычнае забеспячэнне работы | Самакантроль (формы, тэрміны) | Запланаваныя вынікі |
|---|---|---|---|---|---|
| | з педагогамі | з навучэнцамі | | | |
| 1. | Аналіз вынікаў дзейнасці, апрацоўка дадзеных, вызначэнне ступені адпаведнасці дасягнутых вынікаў крытэрыям і паказчыкам | Правядзенне выніковага маніторынгу ўзроўню матывацыі да вывучэння беларускай мовы | Метадычныя матэрыялы, на аснове якіх распрацоўваюцца дыягнастычныя інструменты. Крытэрыі і паказчыкі ацэнкі вынікаў педагагічнага праекта | Абмеркаванне вынікаў маніторынгу на паседжанні творчай групы | Павышэнне ўзроўню прадметных кампетэнцый у вучняў |
| 2. | Абагульненне і трансляцыя педагагічнага вопыту | | Матэрыялы педагагічнага праекта | Выніковая справаздача аб рэалізацыі праекта | Трансляцыя вопыту работы ў СМІ. Метадычныя рекамендацыі |

Каляндарны план рэалізацыі педагагічнага праекта
“Фарміраванне станоўчай матывацыі да вывучэння беларускай мовы ў вучняў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі
праз стварэнне медыятэкстаў”
на 2024/2025 навучальны год

| № п/п | Мерапрыемствы | Тэрміны | Адказныя |
|---|---|---|---|
| 1. | Азнаямленне калектыву з педагагічным праектам. Фарміраванне творчай групы. Размеркаванне абавязкаў паміж педагогамі-ўдзельнікамі пректа | Да 01.09.2024 | Бурко А.Р., дырэктар установы адукацыі; Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці, Панкратава А.Я., настаўнік беларускай мовы і літаратуры |
| 2. | Стварэнне сістэмы кіравання праектам: лакальныя нарматыўныя дакументы | Да 01.09.2024 | Бурко А.Р., дырэктар установы адукацыі; Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці, Панкратава А.Я., настаўнік беларускай мовы і літаратуры |
| 3. | Стварэнне інфармацыйнага асяроддзя (размяшчэнне інфармацыі аб рэалізацыі праекта на сайце, Тэлеграм-канале ўстановы адукацыі, інфармацыйных стэндах) | Да 10.09.2024 | Андрыеўская Ю.С., настаўнік инфарматыкі; Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці |
| 4. | Правядзенне метадычных майстэрняў для падрыхтоўкі педагогаў да ўдзелу ў праекце | Да 30.12.2024 | Панкратава А.Я., настаўнік беларускай мовы і літаратуры, Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці |
| 5 | Пасяджэнне метадычнага аб’яднання | Да 10.09.2024 | Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці |
| 6. | Пасяджэнне творчай групы | Да 20.09.2024 | Панкратава А.Я., настаўнік беларускай мовы і літаратуры; Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 7. | Правядзенне ўводнага маніторынгу ўзроўню матывацыі вучняў да вывучэння беларускай мовы | Да 15.10.2024 | Жылянок М.А., педагог-псіхолаг |
| 8. | Правядзенне ўводнага маніторынгу асобасных адукацыйных вынікаў вучняў па беларускай мове | Да 15.10.2024 | Жылянок М.А., педагог-псіхолаг |
| 9. | Стварэнне віртуальнага метадычнага кабінета для ўдзельнікаў праекта | Да 01.11.2024 | Андрыеўская Ю.С., настаўнік инфарматыкі; Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці |
| 10. | Правядзенне прамежкавага маніторынгу ўзроўню матывацыі вучняў да вывучэння беларускай мовы | Да 20.05.2024 | Жылянок М.А., педагог-псіхолаг |
| 11. | Правядзенне прамежкавага маніторынгу асобасных адукацыйных вынікаў вучняў па беларускай мове | Да 20.05.2024 | Жылянок М.А., педагог-псіхолаг |
| 12. | Педагагічны савет па тэме праекта | Да 30.12.2024 | Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці |
| 13. | Распрацоўка алгарытмаў, памятак для настаўнікаў па скарыстанні медыятэксту як способу вучэбнай дзейнасці | Да 30.12.2024 | Панкратава А.Я., настаўнік беларускай мовы і літаратуры; настаўнікі-прадметнікі |
| 14. | Падрыхтоўка рэкамендацый для вучняў па рабоце з медыятэкстамі | Да 30.12.2024 | Панкратава А.Я., настаўнік беларускай мовы і літаратуры |
| 15. | Правядзенне адкрытых урокаў, мерапрыемстваў, майстар-класаў, пасяджэнняў метадычных аб’яднанняў | 02.11.2024 – 31.03.2025 | Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці, Панкратава А.Я., настаўнік беларускай мовы і літаратуры, настаўнікі-прадметнікі |
| 16. | Стварэнне каталога метадычных прадуктаў | Да 30.04.2025 | Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці, Панкратава А.Я., настаўнік беларускай мовы і літаратуры |
| 17. | Аказанне кансультатыўнай дапамогі педагогам | 02.11.2024 – 31.03.2025 | Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці, Панкратава А.Я., |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | настаўнік беларускай мовы і літаратуры |
| 18. | Псіхолага-педагагічнае суправаджэнне работы ўдзельнікаў праекта | На працягу рэалізацїі праекта | Жылянок М.А., педагог-псіхолаг |
| 19. | Узаеманаведванне ўрокаў, мерапрыемстваў, іх аналіз | На працягу рэалізацїі праекта | Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці; настаўнікі-прадметнікі |
| 20. | Прэзентацыя вопыту работы педагогогаў-прадметнікаў па скарыстанні вучнёўскіх медыятэкстаў як спосабу вучэбнай дзейнасці | Да 31.05.2025 | Панкратава А.Я., настаўнік беларускай мовы і літаратуры |
| 21. | Ацэнка эфектыўнасці праекта ў адпаведнасці з крытэрыямі ацэнкі якасці працэсу рэалізацыі педагагічнага пректа і адукацыйных паслуг | Да 31.05.2025 | Бурко А.Р., дырэктар установы адукацыі; Лапаціна Ю.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці |